

# Віртуозы айчыннай сцэны



**ТАІРАВА Ларыса Сяргееўна** —
намеснік дэкана факультэта музычнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

Разам яны пачалі іграць яшчэ ў сценах роднай альма-матэр, калі ў 1994 годзе сіламі студэнтаў 3-га курса Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі быў створаны дуэт у складзе баяніста Андрэя Сівакова (клас прафесара В. А. Чабана) і балалаечніка Ігара Іванова (клас выкладчыкаў Г. Н. Бранкоўскага і М. В. Ільіной). У той час маладыя музыканты не маглі прадбачыць, што дуэт праз некалькі гадоў ператворыцца ў квартэт салістаў Белдзяржфілармоніі, пра які і пойдзе гаворка.

Першыя поспехі, першыя гастролі па краіне акрылілі, пераканалі апантаных студэнтаў-акадэмістаў у правільнасці выбранага шляху. Класічнае спалучэнне балалайкі і баяна (сольнага і акампануючага інструментаў) давала шырокія магчымасці для творчай фантазіі. З мастацтвам маладых музыкантаў знаёміцца публіка ў Германіі, Францыі. Гастролі сталі выдатнай практыкай і школай у набыцці прафесійнага вопыту. Адначасова Ігар і Андрэй працягвалі сольную кар’еру. Падчас вучобы ў Акадэміі музыкі кожны з іх прымаў удзел у прэстыжных міжнародных конкурсах блізкага і далёкага замежжа. У прыватнасці, у горадзе Клінгенталь (Германія) яны атрымалі званне дыпламантаў Міжнароднага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах. Андрэй Сівакоў з’яўляецца яшчэ і дыпламантам міжнароднага конкурсу «Кубак Далёкага Усходу», што праходзіў ва Уладзівастоку (Расія).

Нельга не адзначыць унікальнасць айчыннай сістэмы музычнай адукацыі, якая дазваляе выявіць і выхаваць таленавітую асобу. Аснову гэтай сістэмы складае бясцэнны педагагічны (кадравы) патэнцыял, памножаны на адшліфаваную гадамі школу падрыхтоўкі музыкантаў на ўсіх этапах адукацыйнай лесвіцы. Вельмі важна ў наш імклівы час захаваць гэтыя дасягненні айчыннай культуры і музычнай адукацыі, не аддаць іх на разбурэнне амбіцыёзным чыноўнікам і рэфарматарам рознага кшталту, якія ў запале сваіх кар’ерных намераў і капіравання заходніх аналагаў замахваюцца на самыя каштоўныя здабыткі ў галіне музычнага мастацтва, што ствараліся дзесяцігоддзямі не адным пакаленнем нашых суайчыннікаў.

Але ж вернемся да нашых герояў. Невядома, колькі б часу праіснаваў гэты творчы саюз двух музыкантаў, каб не выпадак. Напярэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дадні чарговых гастроляў у Францыю замежныя арганізатары выказалі пажаданне, каб у складзе дуэта была домра. Аказваецца, французскія слухачы захапляюцца гучаннем гэтага пяшчотнага інструмента. Вось так да дуэта балалайка — баян (І. Іваноў — А. Сівакоў) далучылася домра — Алена Дзікавіцкая (у будучым Іванова). Яна стала самай маладой удзельніцай ансамбля.

Пасля заканчэння Брэсцкага музычнага каледжа ў 1996 годзе Алена паступіла ў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі ў клас Мікалая Марэцкага. Студэнцкае жыццё яе было надзвычай цікавае і разнастайнае. Асабліва ўдалым для яе стаў 2000 год, калі А. Дзікавіцкая атрымала III прэмію і званне лаўрэата міжнароднага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах «Кубак Поўначы» ў горадзе Чарапавец (Расія) і адзначана спецыяльным прызам — мандалінай японскай фірмы «Судзукі». У гэтым жа годзе яна становіцца ўладальніцай II прэміі і звання лаўрэата Міжнароднага конкурсу імя Рафаэле Калачэ ў горадзе Баломня (Італія).

Па законах інструментальнага жанру новаму пашыранаму ансамблю (балалайка—домра—баян) быў патрэбны бас, які выконваў бы ролю гарманічнага «фундаменту». Ім стала бас-гітара Генадзя Хрулькевіча. У такім квартэтным складзе калектыў распачаў свае замежныя гастролі ў Францыі. Ідэя пашыранага ансамбля спадабалася як удзельнікам, так і слухачам. Некаторы час сфарміраваны калектыў існаваў як бы ў дзвюх іпастасях. З развіццём квартэта працягвалася творчая дзейнасць першапачатковага дуэта І. Іваноў—А. Сівакоў. У гэты перыяд разам з сумеснай ансамблевай працай кожны з музыкантаў удзельнічаў у розных цікавых праектах, конкурсных і канцэртных праграмах.



Ансамбль салістаў Белдзяржфілармоніі пад кіраўніцтвам Ігара Іванова

Так, у 2001 годзе Алена Дзікавіцкая стала стыпендыятам Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, прымала ўдзел у пастаноўцы балета С. Пракоф'ева «Рамэо і Джульета» ў Латвійскім нацыянальным оперным тэатры (Рыга) пад кіраўніцтвам Мсціслава Растраповіча. Асабістая кар'ера маладой дамрысткі, паспяховыя сольныя канцэрты ў Камернай зале Белдзяржфілармоніі знайшлі водгук на прасторах блізкага замежжа. Алену запрашаюць прыняць удзел у канцэртным туры па Залатому кальцу Расіі. Яна выступае ў зале Расійскай акадэміі музыкі (Масква) і ў капэле імя М. Глінкі (Санкт-Пецярбург). У якасці салісткі А. Дзікавіцкая супрацоўнічае з Губернатарскім аркестрам рускіх народных інструментаў Чарапаўца. Паступова творчае супрацоўніцтва Ігара і Алены перарасло ў сямейнае — ідэальнае спалучэнне дзвюх таленавітых асоб. Гэты сямейна-прафесійны дуэт паспрыяў умацаванню ўсяго калектыву аднадумцаў і стаў добрым падмуркам у іх дзейнасці.

Нягледзячы на разнастайныя асабістыя музычныя дасягненні, удзельнікаў ансамбля яднае непераадольнае імкненне да пакарэння новых вышынь у мастацтве. Ігар, Андрэй і Алена ў розны час працягвалі сваю адукацыю ў магістратуры пры Акадэміі музыкі, дзе кожны з іх атрымаў ступень магістра мастацтваў. Натуральна, что менавіта такіх спецыялістаў запрашаюць на работу ў Белдзяржфілармонію. Спачатку толькі дуэт як найбольш вядомы і апрабаваны калектыў, а потым, праз некалькі гадоў, квартэт пад назвай «Славяне» становіцца самастойнай канцэртнай адзінкай на базе філармоніі. Пазней калектыў быў перайменаваны ў Ансамбль салістаў Белдзяржфілармоніі. Такім чынам, афіцыйнай датай нараджэння калектыву трэба лічыць 2003 год.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўны склад ансамбля застаўся нязменным, калі не лічыць бас-гітарыста — артыста Белдзяржфілармоніі Мікалая Абрамовіча. Пасля заканчэння Маладзечанскага музычнага вучылішча па класу кантрабаса ў 1976 годзе М. Абрамовіч быў накіраваны ў Белдзяржфілармонію, дзе працуе і сёння. За плячамі музыканта багаты вопыт работы з многімі вядомымі выканаўцамі, такімі як заслужаныя артысты Беларусі Святлана Кульпа, Вольга Шутава (у складзе ансамбля «Беларускі сувенір»), народны артыст Беларусі і Расіі Яраслаў Еўдакімаў і інш. Гастрольныя маршруты М. Абрамовіча пралягалі не толькі праз неабсяжныя прасторы былога Саюза (ад Уладзівастока да Брэста), але і праз многія краіны далёкага замежжа (Польшча, Венгрыя, Германія, Афганістан і інш.).

Шлях да сэрцаў слухачоў на ніве акадэмічнага мастацтва вельмі няпросты. Спатрэбілася шмат намаганняў, мэтанакіраванай творчай працы, цярпення і часу, каб у калектыва з'явіліся свае прыхільнікі, свае слухачы. Усё, што выконвае Ансамбль салістаў Белдзяржфілармоніі, мае пячатку выдатнага густу. Гэта тычыцца і выбару праграмы, і аранжыроўкі, і непасрэдна выканальніцкага майстэрства. Па зместу творчай дзейнасці калектыў прытрымліваецца акадэмічнага кірунку. Пра гэта сведчыць пераважная большасць твораў сусветнай музычнай класікі ў рэпертуары ансамбля: «Маленькія ветраныя млыны» Ф. Куперэна, «Шчэбет» Ж. Дандрые, Саната соль мінор А. Вівальдзі, Арыя І. С. Баха, сімфанічная паэма «Танец смерці» К. Сен-Санса, «Кармэн-фантазія» П. Сарасатэ—Ж. Бізэ, «Ронда-капрычыёза» Ф. Мендэльсона.

Разам з тым у канцэртныя праграмы ансамбля ўваходзяць арыгінальныя апрацоўкі славянскай музыкі. Перш за ўсё, гэта творы А. Цыганкова — «Частушкі», «Старагародская сюіта», Варыяцыі на тэмы дзвюх рускіх народных песень. Любоў артыстаў ансамбля да народнай музыкі, увабраная імі з дзяцінства, праявілася ў звароце да апрацовак А. Шалава («Пярсцёнак душы-дзяўчыны», «Эх, сып, Сямён!»), Я. Дзярбенкі («Па вёсцы»), А. Шалаева («Руская завіруха»), І. Тамарына («Старадаўні габелен») і інш. Значнае месца ў рэпертуары калектыву займаюць творы беларускіх кампазітараў: Інтэрмецца, «Беларускі сувенір» Г. Ермачэнкава, Таката Г. Гарэлавай, кампазіцыя на беларускую народную тэму «Я табун сцерагу» А. Шпянёва і інш.

Маладыя артысты вельмі ўважліва ставяцца да стылістыкі музыкі розных эпох. У сваіх апрацоўках І. Іваноў і А. Сівакоў стараюцца не толькі захаваць мастацкія вартасці кожнага твора, але і надаць музыцы непаўторнае сучаснае гучанне. Выдатная школа і майстэрства музыкантаў дазваляюць ім спалучаць неспалучальнае, шукаць новыя нязведаныя фарбы па-за межамі свайго жанру. Вынікам такіх эксперыментаў стала выкананне «Лібер-танга» А. П'яцолы сумесна са струнным трыо (скрыпка, альт, віяланчэль). А для выканання «Цыганскай рапсодыі» В. Грыдзіна ў квартэце выкарыстоўваецца фартэпіяна.

Выступленні ансамбля заўсёды праходзяць з аншлагам і нязменным поспехам. Так было і ўлетку, калі на сцэне вялікай філарманічнай залы адбылася творчая сустрэча Ансамбля салістаў Белдзяржфілармоніі і выканаўцаў музыкі кантры і блюграс з ЗША — групы «Тоні Эліс і музыканты Брайберна» (праект, ініцыіраваны пасольствам ЗША). На першы погляд, перад слухачамі з'явіліся два аднолькавыя калектывы, два квартэты. На самай справе артыстаў ядналі толькі колькасны склад удзельнікаў і жаданне дарыць слухачам сваё майстэрства. А вось інструментальны склад, стылістыка і рэпертуар амерыканскага і беларускага квартэтаў кардынальна адрозніваліся адзін ад аднаго. І ў гэтым кантрасце такіх розных і такіх цікавых ансамбляў — асноўная іскрынка канцэрта. Цікава, што кожны ўдзельнік амерыканскага квартэта (таксама сямейнага) валодае некалькімі музычнымі інструментамі (банджа — скрыпка, гітара — вакал, кантрабас — мандаліна, ударныя — клавішныя). Амерыканскія госці музіцыравалі выключна па слыху (яны іграюць без нот), беларускія артысты таксама прадэманстравалі выдатныя імправізатарскія здольнасці пры сумесным выкананні амерыканскай шлюбнай мелодыі «Рука ў руцэ» і эстраднай п'есы С. Качаліна «Старое банджа».

Папулярнасць ансамбля год ад году расце. Але, нягледзячы на цвёрдасць пазіцый у музычным асяроддзі, на свой поспех і запатрабаванасць, артыстам даводзіцца ўсё неабходнае для прафесійнай дзейнасці рабіць самім: за свой кошт набываць сцэнічныя касцюмы, апаратуру, інструменты, пульты. Рэклама і запісы кампакт-дыскаў — таксама клопат саміх музыкантаў. Рэжысура канцэртаў і кожнага нумара паасобку, «раскрутка» артыстаў ансамбля, іх «выгадны продаж» — гэтыя пытанні пакуль для калектыву не вырашальныя.

Сёння Ансамбль салістаў Белдзяржфілармоніі вядзе інтэнсіўную асветніцкую дзейнасць. За сваё нядоўгае артыстычнае жыццё калектыў даў сотні канцэртаў па ўсёй краіне і за яе межамі.

Нам застаецца пажадаць таленавітым музыкантам новых творчых здзяйсненняў, цікавых гастрольных маршрутаў і новых паклоннікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ